ЭКСПЕРТНАЕ ЗАКЛЮЧЭННЕ
на элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны
"Абрад «Ваджэнне Сулы» на другі дзень Вялікадня
ў Гомельскім раёне Гомельскай вобласці"

Абрад "Ваджэнне Сулы" ў Гомельскім раёне Гомельскай вобласці з'яўляецца лакальным варыянтам абраду "Ваджэнне і пахаванне Стралы (Сулы)", які ўласцівы для сярэдняга Падняпроўя і басейнаў рэк Сож і Дзясна і пачынаецца з Вялікадня (у некаторых месцах з Дабравешчання) і завяршаецца на Ушэсце. У вёсках Гадзічава і Маркавічы Гомельскага раёна ваджэнне Сулы адрозніваецца дакладнай прымеркаванасцю да другога дня Вялікадня і распачынае час моладзевых гулянняў на вуліцы. Элемент дэманструе надзвычай яркую карагодную традыцыю, якая існуе ў жывым бытаванні і сёння, праводзіцца мясцовай моладдзю. Актыўны ўдзел у карагодах прымаюць і сталыя жыхары, а таксама шматлікія госці, найперш з гг. Гомеля і Мінска. Адметнасць абраду ваджэння Сулы ў Гомельскім раёне – аб'яднанне жыхароў дзвюх вёсак (Гадзічава і Маркавічы) падчас выканання абрадавых дзеянняў. Карагоды і гульні, што суправаджаюць ваджэнне Сулы, з'яўляюцца арыгінальнымі лакальнымі варыянтамі, якія, выяўляючы тыповыя рэгіянальныя рысы, адрозніваюцца мясцовай спецыфікай.

Варта адзначыць, што абрад "Ваджэнне і пахаванне Стралы (Сулы)" – спецыфічная адметнасць веснавой каляндарнай абраднасці Гомельска-Бранска-Чарнігаўскага рэгіёна. Першыя навуковыя запісы фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў пра гэты абрад былі зроблены фалькларыстамі-збіральнікамі XIX стагоддзя З. Даленгам-Хадакоўскім, З.Ф. Радчанка, Е.Р. Раманавым і інш. Як было адзначана даследчыкамі Г.А. Барташэвіч, В.Я. Гусевым, Ю.І. Марчанкам, Л.М. Салавей, К.П. Кабашнікавым, А.С. Лісам, В.Д. Ліцвінкам, З.Я. Мажэйка, В.А. Пашынай, Ю.М. Чурко, В.І. Ялатавым, А.Ю. Лозкам, М.А. Козенкам, В.С. Новак, І.В. Глушэц і інш., рэгіянальны абрад "Ваджэнне і пахаванне Стралы (Сулы)" мае шэраг лакальных асаблівасцей. Гэта датычыць і назвы абраду, якая багата вар'іруецца ў мясцовых традыцыях ("Страла", "Сула", "Колік", "Сена", "Хрэн", "Ганяць старцоў", "Ёлка", "Провады вясны", "Вадзіць вясну", "Ушэсце" і інш., якія "прыжыліся" ў пэўнай мясцовасці і набылі своеасаблівы сакральны сэнс), але замацавана ў навуковай літаратуры пад агульнай назвай "Ваджэнне і пахаванне Стралы (Сулы)".

Адзначым, што рэгіянальны абрад "Ваджэнне і пахаванне Стралы (Сулы)" мае багатую лакальную спецыфіку ў розных канкрэтных праявах на такіх узроўнях, як час і месца правядзення, структура, склад удзельнікаў, семантыка рытуальных дзеянняў, сімволіка прадметнай

атрыбутыкі і г.д. Так, у вёсках памежнага з Беларуссю Навазыбкаўскага раёна Бранскай вобласці (Расія) “Страла” прадстаўлена ў сваім класічным выглядзе. Праводзіцца ў перыяд ад другога дня Вялікадня і завяршаецца на Ушэсце (месцамі на Тройцу). Уяўляе сабой абыход вёскі са спецыяльнымі “стрелецкими” песнямі, ваджэнне карагодаў, суправаджаецца ўдзелам пераапранутых “бабы” і “дзеда”, завяршаецца сімвалічным “пахаваннем” у жытнёвым полі адметных абрадавых атрыбутаў (жытнёвых каласкоў, манет, стужак і г.д.). Абрадавыя дзеянні, па ўяўленнях жыхароў, накіраваны на прадуцыраванне добрага ўраджаю і абарону ад маланкі. У больш аддаленых ад тэрыторыі Беларусі вёсках Браншчыны (напрыклад, у Гардзееўскім раёне) абрад у асноўным напаўняецца ваджэннем гульнявых карагодаў. Паводле звестак, зафіксаваных ад перасяленцаў з вёсак Чарнобыльскага раёна Кіеўскай вобласці (Украіна), “водінням Стріли” на Дабравешчанне распачыналіся веснавыя гульбішчы. У вёсках Чарнігаўскай вобласці (Украіна) абрад “Стріла” фіксуецца на другі дзень Вялікадня (падрабязныя звесткі пра варыянты абраду “Ваджэнне і пахаванне стралы” можна знайсці ў выданнях, пазначаных у спісе літаратуры).

У розных вёсках Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці можна назіраць адметнасці не толькі ў абрадавых дзеяннях, песенным суправаджэнні, прадметным рэквізіце, але і ў семантычнай скіраванасці функцыянальнасці абрадавых дзеянняў. Абыход вёскі з абрадавымі карагодамі і ваджэнне карагодаў у жытнёвым полі адбываецца падчас ваджэння і пахавання Стралы ў в. Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна. Абрад унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, адрозніваецца часам правядзення (Ушэсце, 40 дзён пасля Вялікадня, маркіруе завяршэнне веснавой пары), наяўнасцю рытуальных дзеянняў як з прадметнай атрыбутыкай (манеты, “занізкі”, “уплёты”), закопванне якой у зямлю з’яўляецца праявай апатрапеічнай і прадуцыравальнай магіі, так і з жытнёвымі каласамі, якімі абвязваюцца, “каб не балела сярэдзіна”, і захоўваюць у хаце за абразамі для засцярогі членаў сям’і, хаты і падвор’я.

Фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі, праведзеныя на тэрыторыі Гомельскага раёна ў розныя гады выкладчыкамі і студэнтамі ВНУ Рэспублікі Беларусь, супрацоўнікамі мясцовых устаноў культуры і адукацыі, дзяржаўных навуковых устаноў, аматарамі-краязнаўцамі, даюць падставы зрабіць высновы аб геаграфіі бытавання і ўстойлівасці захавання абраду “Ваджэнне Сулы”. У памяці інфармантаў і сёння захоўваюцца звесткі пра гэты абрад у вёсках Краўцоўка, Грабаўка, Глыбоцкае, Новая Гута, Паддабранка, Рагі Ілецкія і інш. Што да пытання семантыкі абраду “Ваджэнне Сулы” на тэрыторыі Гомельскага раёна, то варта заўважыць, што амаль адсутнічаюць іншыя тлумачэнні,

акрамя магічнай прымеркаванасці абрадавых дзеянняў і песень да добрай ураджайнасці на агародзе і палетках, а таксама засцярогі ад звышнатуральнага ўздзеяння і забеспячэння здароўя ўсіх вяскоўцаў. Цікавай лакальнай адметнасцю абраду з’яўляецца той факт, што, пачынаючы рытуалы ў адной вёсцы, іх завяршаюць у другой (напрыклад, Гадзічава і Маркавічы, Краўцоўка і Дзікалаўка), што садзейнічае яднанню супольнасцей.

У параўнанні з іншымі вёскамі Гомельскага раёна, менавіта ў вёсках Гадзічава і Маркавічы ў найлепшай ступені зафіксаваны ад старажылаў і даследаваны звесткі пра абрад “Ваджэнне Сулы”, што і дазволіла краязнаўцам-энтузіястам разам з вяскоўцамі адрадзіць гэту цікавую з’яву ў натуральных умовах. Падрабязныя звесткі пра абрад у вёсках Гадзічава і Маркавічы (паводле сведчанняў інфармантаў, вадзілі Сулу да 1967 года) былі сабраны дзякуючы глыбокай зацікаўленасці настаўнікаў Рыгора Ціханавіча Басава і Марыі Аляксандраўны Герасенка. Краязнаўцамі-аматарамі былі прыкладзены вялікія намаганні для адраджэння гэтай з’явы з 2007 года. З таго часу абрад штогод праводзіцца ў вёсках Гадзічава і Маркавічы з захаваннем першародных форм, структуры, мясцовых асаблівасцей на ўзроўнях моўнай гаворкі, меласу, формы карагодаў і гульняў, традыцыйнага строю і абрадавых страў.

Варта адзначыць, што высакародную справу захавання і папулярызацыі абраднасці ваджэння Сулы працягвае ў роднай вёсцы Маркавічы краязнаўца Віктар Уладзіміравіч Шыпкоў (оперупаўнаважаны аддзела крымінальнага вышуку крымінальнай міліцыі аддзела ўнутраных спраў Гомельскага райвыканкама, старшы лейтэнант міліцыі), які разам са сваімі настаўнікамі правёў вялікую работу па вывучэнні традыцыйнай матэрыяльнай і духоўнай культуры сваёй мясцовасці, рэканструкцыі народнага строю. Натхнёны ідэяй адраджаць традыцыі ў будучым у іншых вёсках Гомельскага раёна, ён не спыняе сваёй працы ў гэтым кірунку. Нельга не адзначыць, што Віктар Уладзіміравіч як ініцыятар захавання народнай культуры актыўна далучае да гэтай пачэснай справы не толькі членаў сваёй сям’і, але і іншых людзей, нераўнадушных да спадчыны продкаў.

Прааналізаваныя матэрыялы шматлікіх інтэрв’ю, праведзеных непасрэдна з рознаўзроставымі групамі мясцовых жыхароў, пацвярджаюць актуальнасць і сацыяльна-практычную запатрабаванасць правядзення абраду “Ваджэнне Сулы”, нягледзячы на пэўныя гістарычныя абставіны і перашкоды.

Элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны “Абрад «Ваджэнне Сулы» на другі дзень Вялікадня ў вёсках Гадзічава і Маркавічы Гомельскага раёна Гомельскай вобласці” можна

рэкамендаваць да надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь, паколькі гэта абрадавая з’ява:

1) адпавядае азначэнню нематэрыяльнай культурнай спадчыны, дадзенаму ў арт. 2 п. 1 Канвенцыі 2003 г. аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (ЮНЕСКА), а менавіта:
   а) мае адпаведную форму – дакладнае ўзнаўленне розных форм ваджэння самабытных мясцовых абрадавых карагодаў (шэсце шарэнгай па вуліцах вёсак, кола і “крывы танок”) і гульняў, якія арганічна ўзаемазвязаны;
   б) прымеркавана да пэўнага часу правядзення (другі дзень Вялікадня) і месца (скрыжаванне дарог, поле), мае полаўзроставую рэгламентацыю кола ўдзельнікаў (у карагодах удзельнічаюць толькі дзяўчаты і жанчыны);
   в) захоўвае цэласнасць структуры абраду, у якой вылучаюцца пэўныя кампаненты: ваджэнне асобнага карагода ў форме кола ў вёсцы Гадзічава, шэсце ўдзельнікаў па Кацярынінскім шляху ў вёску Маркавічы, далучэнне жыхароў вёскі Маркавічы да шэсця, ваджэнне сумесных карагодаў, падкідванне ўгору маленькіх дзяцей, сустрэча Сулы жыхарамі вёскі Маркавічы з абрадавым хлебам-“паскай”, сумеснае шэсце за вёску ў поле, калектыўнае частаванне і гулянне;
   г) з’яўляецца жывой традыцыяй – актуальнай і запатрабаванай як лакальнай супольнасцю, так і жыхарамі этнаграфічнага рэгіёна Пасожжа, успрымаецца носьбітамі як сакральнае дзейства;
   д) існуе як арганічная частка культурнай спадчыны Гомельскага раёна, усведамляецца мясцовымі жыхарамі як неад’емная каштоўнасць у іх побыце, што дакументальна пацвярджаецца шматлікімі экспедыцыйнымі фальклорна-этнаграфічнымі звесткамі і матэрыяламі інтэрв’ю саміх інфармантаў, іх асабістай зацікаўленасцю ў пераемнасці гэтай традыцыі ад продкаў, калектыўнай згодай супольнасці на падтрымку гэтага абраду, надзеяй на яе працяглае бытаванне ў будучым, дзякуючы далучэнню школьнікаў і мясцовай моладзі і арганізацыі сістэмнай работы па адраджэнні, захаванні і папулярызацыі;

2) адпавядае крытэрыям адбору нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека для надання ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, абазначаным у арт. 92 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры:
   а) з’яўляецца адным з фактараў фарміравання нацыянальнага менталітэту (п. 1.1), бо садзейнічае фарміраванню цікавасці да гісторыі роду, малой радзімы, народнай спадчыны, яднанню і самасцвярджэнню супольнасці ў этнічным плане, усведамленню пачуцця нацыянальнай самасвядомасці праз далучэнне да

абрадаў і звычаяў малой радзімы, павагу да традыцыйнай культуры мінулага, пашану да продкаў;

б) мае значнасць з пункту гледжання эстэтыкі, навукі і культуры – абрад стварае адметнае, сапраўды прыгожае свята вёскі: жанчыны і дзяўчаты ў прыгожых па-мясцоваму адметных самаробных строях водзяць карагоды і спяваюць, што прыносіць маральнае і эстэтычнае задавальненне; прадстаўленыя аўтэнтычныя запісы звестак пра элемент упершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак, узбагачаюць агульную карціну бытавання абраднасці і паэзіі ваджэння і пахавання Стралы (Сулы) (п. 1.2);

в) непасрэдна звязана з традыцыямі, вераваннямі, што ўплывае на спасціжэнне і глыбокае асэнсаванне светапогляду нашых продкаў і ў цэлым аказвае значны ўплыў на культурнае і духоўнае развіццё беларускага народа (п. 1.3).

Улічваючы, што абрад “Ваджэнне Сулы” на другі дзень Вялікадня ў Гомельскім раёне Гомельскай вобласці з’яўляецца адноўленым, дадзены элемент адпавядае катэгорыі “Б” нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Прафесар кафедры рускай і сусветнай літаратуры
ўстановы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны”,
доктар філалагічных навук — В.С. Новак

Вядучы метадыст па этнаграфіі і фальклоры ўстановы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці”,
магістр мастацтвазнаўства — І.В. Глушэц

Подпись И.В. Глушец заверяю инспектор по кадрам учреждения "ГОЦНТ" И.Ю. Лепр

АДДЗЕЛ КАДРАЎ
Подпіс В.С. Новак
ЗАВЯРАЮ
начальнік аддзела кадраў установы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны"